**Н.Я.Петушко,** *ст.выкладчык*

# ГУМАНІСТЫЧНАЯ НАКІРАВАНАСЦЬ ПАДРЫХТОЎКІ БУДУЧЫХ БІБЛІЯТЭКАРАЎ ДА РАБОТЫ З ЧЫТАЧАМІ З АСАБЛІВАСЦЯМІ ПСІХАФІЗІЧНАГА РАЗВІЦЦЯ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Якасная падрыхтоўка спецыялістаў у вышэйшай школе – важная ўмова забеспячэння эканамічнага і сацыякультурнага прагрэсу, паскарэння сацыяльна-эканамічных і грамадска-палітычных пераўтварэнняў у грамадстве. Кансерватызм у метадах арганізацыі вучэбнага працэсу, недахоп сродкаў на абнаўленне навуковай і інфармацыйнай базы, слабае матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне выклікалі неабходнасць распрацоўкі новых падыходаў да сістэмы вышэйшай адукацыі, канкрэтызацыі яе мэт, задач, прынцыпаў і шляхоў удасканалення.

Па гэтай прычыне ў пачатку 90-х гадоў XX ст. у рэспубліцы пачалася рэформа вышэйшай школы. У аснову навучання і выхавання асобы пакладзены прынцыпы дэмакратызацыі, гуманітарызацыі, гуманізацыі, бесперапыннасці адукацыі, павышэння якасці прафесійнай падрыхтоўкі.

Канцэпцыя адукацыі распрацавана ў дачыненні да вышэйшай школы [6]. Яна рэалізоўвалася ў 1999–2004 гадах і прадугледжвала комплекс эканамічных, фінансавых, кіраўніцкіх, арганізацыйных, кадравых рашэнняў. Асабліва падкрэслена роля

вышэйшых навучальных устаноў не толькі ў кірунку падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў, але і ў кірунку выхавання ў іх актыўнай жыццёвай пазіцыі, грамадзянскай адказнасці, высокіх маральна-этычных якасцей. Менавіта высокія маральна-этычныя якасці маладых спецыялістаў на фоне негатыўных з'яў у грамадстве (страты канштоўнасных арыенціраў, ідэалаў, духоўнасці і інш.) дапамагаюць сацыяльна не абароненым групам насельніцтва, а тым больш інвалідам і людзям з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця адаптавацца, знайсці месца ў жыцці, інтэгравацца ў пэўнае асяроддзе. Патрэбна адзначыць, што людзей, якім неабходна сацыяльна-псіхалагічная падтрымка, у нашым грамадстве з кожным годам становіцца ўсё больш.

Таму адным з кірункаў сучаснай сацыякультурнай палітыкі Рэспублікі Беларусь з'яўляецца стварэнне ўмоў для інтэграцыі асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця ў грамадства [3]. На гэта звяртаюць увагу грамадскія і дабрачынныя арганізацыі, ствараецца нарматыўна-прававая база. На высокім узроўні зацверджана праграма «Дзеці Беларусі», дзейнічае яе падпраграма «Дзеці-інваліды», прыняты шэраг палажэнняў: Палажэнне аб інтэграваным навучанні дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, Палажэнне аб пункце (цэнтры) карэкцыйна-педагагічнай дапамогі, Палажэнне аб рэспубліканскім цэнтры рэабілітацыі дзяцей з парушэннямі слыху, распрацаваны інструкцыі па навучанні ў дамашніх умовах дзяцей дашкольнага ўзросту з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця і дзяцей-інвалідаў.

Інтэграцыя асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця ў грамадства як важны кірунак сучаснай сацыякультурнай палітыкі Рэспублікі Беларусь знайшла адлюстраванне ў законе «О предупреждении инвалидности и реабилитации инвалидов» (1994), у Дзяржаўнай праграме па прадухіленні інваліднасці і рэабілітацыі інвалідаў [2].

Характэрна, што на праблему сацыяльнай інтэграцыі асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця звернута ўвага і ў законе «Аб бібліятэчнай справе ў Рэспубліцы Беларусь» (1995). Гэтым

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

падкрэсліваецца вялікая і адказная місія бібліятэкі, дзейнасць якой павінна быць накіравана на прадастаўленне ўсім грамадзянам адкрытага доступу да інфармацыі, духоўнае развіццё грамадства, гуманізацыю стасункаў паміж людзьмі, на асаблівую ўвагу да сацыяльна не абароненых груп насельніцтва.

Для выканання гэтай місіі бібліятэкам патрэбны спецыялісты – дыпламаваныя сацыяномы, якія б атрымалі не толькі высокую прафесійную падрыхтоўку, але і сфарміравалі светапогляд – цэласную сістэму ўяўленняў аб людзях з абмежаванымі магчымасцямі і асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця.

Такія спецыялісты больш за ўсё неабходныя ў спецыяльных бібліятэках, створаных для сляпых, глухіх, навучэнцаў спецыяльных і дапаможных школ-інтэрнатаў, лячэбных, праваахоўных і іншых устаноў. Гэтыя бібліятэкі па сутнасці выконваюць функцыі цэнтраў па сацыяльнай рэабілітацыі.

Назапашванне багатага практычнага вопыту бібліятэкараў у рабоце з асобамі з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця выклікала павышаную зацікаўленасць бібліятэказнаўцаў да сацыяномікі – тэорыі і методыкі сацыяльнай работы [5,10,11]. Даследаванні вучоных па дадзенай праблеме дазваляюць вылучыць некалькі кірункаў новай галіны ведаў – бібліятэчнай сацыяномікі. Гэта дэфекталагічны (карэкцыйна-педагагічны), геранталагічны, медыцынскі (бібліятэрапеўтычны), пенітэнцыярны кірункі.

Дэфекталагічнае бібліятэказнаўства (тыфлабібліятэказнаўства, сурдабібліятэказнаўства, алігафрэнабібліятэказнаўства) вывучае праблемы бібліятэчнага абслугоўвання асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця.

Геранталагічны кірунак у бібліятэчнай сацыяноміцы прадстаўлены вынікамі вывучэння чытацкіх запытаў пажылых людзей, а медыцынскі (бібліятэрапеўтычны) дапамагае раскрываць кампенсаваныя магчымасці кнігі, яе тэрапеўтычнае ўздзеянне на чалавека.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Пенітэнцыярны кірунак звязаны са спецыфікай бібліятэчнай працы з чытачамі ва ўмовах папраўча-працоўных устаноў, турэмных бібліятэк.

Гіпатэтычна сацыяльная работа як асобы від дзейнасці павінна ажыццяўляцца не толькі ў спецыяльных, але і ў розных тыпах бібліятэк [4, 9, 12]. Для гэтага будучаму спецыялісту, як мы адзначалі вышэй, неабходна авалодаць як прафесійнымі ведамі і ўменнямі, так і метадамі падтрымкі, карэкцыі і рэабілітацыі. Важным кампанентам дзейнасці бібліятэкара становіцца яго альтруістычная, гуманістычная жыццёвая пазіцыя, якая дазваляе пазітыўна ўспрымаць чалавека, у тым ліку з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, лёгка кантактаваць з ім, выклікаць да сябе прыязнасць. Духоўнай дамінантай для спецыяліста павінна стаць міласэрнасць як асобасная індывідуальна-псіхалагічная якасць.

Даследаванні бібліятэчных работнікаў, якія працуюць з людзьмі з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця [1,7,8], сведчаць аб тым, што ўспрыманне іх іншымі членамі грамадства залежыць ад віду і ступені дэфекту, а таксама ад узросту і вопыту зносін з імі. Стэрэатып асобы, напрыклад з дэфектамі зроку, ва ўспрыманні дарослых, у адрозненне ад успрымання падлеткаў і моладзі, характарызуецца выражанай негатыўнай эмацыянальна-ацэначнай накіраванасцю. Людзі, якія практычна не маюць вопыту зносін і ўзаемадзеяння з асобай з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, даюць ёй толькі негатыўныя характарыстыкі. З павелічэннем інфармацыі і непасрэднага вопыту ўзаемаадносін у людзей адбываецца пазітыўны зрух у змесце эмацыянальна-ацэначнай накіраванасці іх стэрэатыпаў. Студэнцкі ўзрост дазваляе асэнсавана падысці да ўспрымання асобы з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, якая мае права на незалежнае жыццё ва ўмовах соцыуму.

Таму ў вучэбны працэс ВНУ неабходна ўключаць дысцыпліны, якія непасрэдна ці апасродкавана раскрываюць праблемы гуманізацыі стасункаў людзей, фарміруюць веды аб прыродзе

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

псіхафізічнага стану асобы. Вучэбныя прадметы ўмоўна можна размеркаваць па блоках.

Да агульнаадукацыйнага блока адносяцца філасофія, рэлігіязнаўства, культуралогія, сацыялогія, педагогіка, узроставая псіхалогія, літаратура. Гэтыя курсы раскрываюць агульныя падыходы ў пэўнай галіне ведаў, дазваляюць сфарміраваць светапогляд і пазітыўныя адносіны да асобы з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця.

Спецыяльны блок уключае дысцыпліны, якія садзейнічаюць набыццю прафесійных ведаў і ўменняў у галіне прадметаў спецыяльнасці (напрыклад, уводзіны ў спецыяльнасць, бібліятэказнаўства: тэорыя, бібліятэчныя фонды і каталогі, абслугоўванне карыстальнікаў).

Дадатковы блок уключае дысцыпліны спецыялізацый, якія дазваляюць студэнту пашырыць сферу сваёй прафесійнай кампетэнцыі (напрыклад, бібліятэрапія, бібліятэчныя зносіны, чытачазнаўства).

Безумоўна, найбольшы поспех у рабоце ВНУ па гуманістычнай накіраванасці падрыхтоўкі будучых бібліятэкараў для работы з чытачамі з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця будзе дасягнуты пры распрацоўцы і ўвядзенні на факультэце інфармацыйна-дакументных камунікацый курса па выбары «Бібліятэчная сацыяноміка». На наш погляд, такі курс садзейнічае паглыбленаму вывучэнню студэнтамі тэарэтыка-метадалагічных асноў сацыяльнай работы бібліятэк, а таксама фарміраванню ў іх каштоўнаснай арыентацыі ў адносінах да асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця.

1. *Библиотеки* для слепых и дети-инвалиды: Сб. статей / Ред. - сост. Г.П. Коваленко; Рос. гос. б-ка для слепых . – М., 1998. – 55с.

2. *Государственная* программа по предупреждению инвалидности и реабилитации инвалидов. – Мн., 1997. – 11с.

3. *Григорьев А.Д.* Социальная работа на Беларуси: история, опыт, проблемы.- Мн.: Дизайн ПРО, 2000. – С.140–173.

4. *Диянская Г.П.* Интегрированное библиотечное обслуживание инвалидов по зрению: Лекция / МГУК; Рос.гос.б-ка для слепых. – М., 1999. – 39с.

5. *Диянская Г.П.* Принцип равных возможностей в тифлобиблиотековедении и библиотечном обслуживании инвалидов по зрению / Рос.гос.б-ка для слепых. –М.,1998. – 344 с.

6. *Концепция* развития высшего образования в Республике Беларусь // Кіраванне ў адукацыі. – 1999. – № 3. – С.94–104.

7. *Коррекционно-развивающая* работа с детьми и подростками в условиях детской библиотеки: Сб. статей / Ред.-сост. О.Л.Кабачек. – Вып.2. – М., 1999. – 152 с.

8. *Самохина Е.О.* Коррекционно-воспитательная работа библиотекаря с читателями – младшими школьниками: Лекция / МГУК. – М., 2000. – 35 с.

9. *Сацыяльна-псіхалагічныя* аспекты бібліятэчнай работы: Метад. рэкамендацыі / Нац. б-ка Беларусі; Склад. М.У. Сокал. – Мн., 2001. – 34 с.

10. *Столяров Ю.Н.* Структурирование библиотековедения как научной дисциплины и предмета преподавания // Книга: исследования и материалы: Сб. – М., 1994. – С.135–159.

11. *Шапошников А.Е.* Библиотечное обслуживание инвалидов: история, современность, тенденции. – М., 1992. – 210 с.

12. *Шапошников А.Е.* Место массовой библиотеки в системе обслуживания инвалидов // Библиотековедение. – 1995. – №2. – С.52–57.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ